В отраслевом разрезе реформирование государственной собственности характеризуется следующими показателями. Судя по результативным данным двенадцатилетней выборки, самым высоким спросом пользуются предприятия торговли (приватизировано 1159 предприятий, 95% из которых составляет коммунальная сфера). В промышленности реформировано 1088 в основном крупных по размерам предприятий, более половины из которых (59%) составляют предприятия агропромышленного комплекса. В сфере бытового обслуживания переведено на частные рельсы хозяйствования 423 объекта, общественного питания – 246, где почти все реформированные предприятия в недавнем прошлом находились в коммунальной собственности (95%). Меньше всего потенциальных хозяев и инвесторов привлекает строительство (218 предприятий), жилищно-коммунальное хозяйство (102 предприятия), транспорт и связь (68 предприятий) (рис. 3).




Рис. 3. Преобразование государственных предприятий в структуры рыночного типа в отраслевом разрезе (1991–2002 гг.)

В заключение следует отметить, что как процесс разгосударствления и приватизации государственной собственности в Республике Беларусь сам по себе, так и анализ этого процесса не решают всех связанных с собственностью проблем, но являются ключевым, отправным моментом в экономических реформах, обеспечивающим реальное многообразие форм собственности и хозяйствования.

УДК 339.13

А.У. Яфімаў, асістэнт

## ПРА ЎЗАЕМАЗАЛЕЖНАСЦЬ ПРАЦЭСАЎ СТРУКТУРНЫХ І МАЁМАСНЫХ ПЕРАЎТВАРЭННЯЎ У ЭКАНОМІКАХ ТРАНЗІТЫЎНАГА ТЫПУ

The sequence and interdependence between privatization and restructuring at macrolevel in transitive economies are considered in this article.

У эканамічнай навуцы ўвогуле ці ў той яе частцы, якая называецца «эканомікай пераходнага перыяду» (economics of transition), няма адназначнага і роўнапрынятага сярод навукоўцаў падыходу да пытанняў пра хуткасць, характар і кірунак прыватызацыі, а тым больш пра яе ўзаемасувязь і паслядоўнасць са структурнай перабудовай усіх складовых кампанентаў нацыянальнай эканомікі на ўсіх узроўнях рэфармавання. Тлумачыцца гэта розным разуменнем, дыферэнцаваным інтэрпрэтаваннем дасягнутых урадамі ў пэўных краінах тых ці іншых мэтаў, сувязаных з гэтымі абодвума працэсамі; адрозным тлумачэннем паняццяў прыватызацыі ў розных эканамічных школах і тым больш рэструктурызацыі, якая ў выглядзе вылучанай у тэарэтычным плане катэгорыі існуе на працягу яшчэ меншага часу, не паспела пакуль акрэсліцца ў пэўную тэорыю.

Нягледзячы на ўсе наяўныя супярэчнасці, варта паспрабаваць хоць павярхоўна прааналізаваць падыходы некаторых навукоўцаў да гэтых абодвух паняццяў і іх узаемасувязі, зрабіўшы пэўныя высновы з мэтай далейшага больш дэталёвага разгляду.

Калі разглядаць узаемасувязі складальнікаў зменаў на макраўзроўні, дык датычна гэтага вядомы польскі даследнік транзітыўных эканомік Л. Бальцэровіч вылучае наступныя тры элементы пераходнага перыяду [1]:

1) макраэканамічная стабілізацыя (скіраваная на ўтаймаванне гіперінфляцыі праз увядзенне кантролю за заробкавай платай ды рэгуляваннем стаўкі пазыковага адсотку);

2) мікраэканамічная лібералізацыя (дасягаецца праз разняволенне цэнаў на тавары і паслугі, скасаванне юрыдычных і адміністрацыйных бар'ераў на стварэнне новых прыватных прадпрыемстваў; лібералізацыя замежнага гандлю; дасягненне канверсаванасці нацыянальнай валюты, прынамсі ў бягомых фінансавых аперацыях);

3) карэнная базісная перабудова (ажыццяўляецца шляхам змены адпаведных гаспадарчых інстытуцыяў у розных сферах – маштабным маёмасным рэфармаваннем дзяржаўных гаспадарчых суб'ектаў як праз поўную перадачу правоў уласнасці на іх прыватным фізічным асобам і калектывам, так і праз зліквідаванне безнадзейна стратных і састарэлых дзяржаўных прадпрыемстваў, а таксама пазбаўленне ўрада прэрагатывы кіравання прадпрыемствам і перадачу частковых правоў распараджэння ім адміністрацыі з захаваннем дзяржаўнага дагляду; у межах гэтага этапу таксама ладзіцца банкаўская, падатковая і іншыя рэформы разам з рэструктурызацыяй).

Другі польскі эканаміст Г. Калодка прыводзіць сваю этапізацыю трансфармацыйнага абшару ў выглядзе трох аспектаў [2]:

1) гаспадарчай лібералізацыі і макраэканамічнай стабілізацыі (пасля лібералізацыі коштаў адбываецца кантроль за ўзроўнем росту цэнаў, абмяжоўваецца памер дэфіцыту дзяржаўнага бюджэту);

2) структурных рэформаў і інстытуцыянальных зменаў (уключае ў сябе прыватызацыю і змену прынцыпаў кіравання прадпрыемствамі);

3) мікраэканамічнай рэструктурызацыі вытворчых магутнасцяў (прыцягненне новых інвестыцыйных рэсурсаў, падвышэнне кваліфікацыі працоўнага персаналу, спыненне і закрыццё старых вытворчасцяў).

Падобную да перыядызацыі пераходнага этапу да Л. Бальцэровіча прыводзяць амерыканскія эканамісты-аналітыкі са структураў Сусветнага Банка і МВФ.

Як бачна, Л. Бальцэровіч не размяжоўвае працэсаў прыватызацыі і рэструктурызацыі ў асобных фазах і не надае ім якой-небудзь паслядоўнасці. У сваю чаргу, Г. Калодка ставіць змену маёмасных арыентыраў на макраўзроўні поруч з макрарэструктурызацыяй, пасля чаго дапускае магчымасць карэктавання працэсаў ажыўлення

спрыватызаваных і наноў створаных прадпрыемстваў на мікраўзроўні. Ізноў тут немагчыма ўсталяваць узаемасувязь паміж прыватызацыяй і структурнай перабудовай на ўзроўні нацыянальнай гаспадаркі, затое бачны дакладна вызначаны пераход спачатку ад спрыяльнай урадавай структурнай палітыкі да зменаў кампанентаў і падсістэмаў функцыянавання прадпрыемстваў. Дзяржава стварае неабходныя інстытуцыянальныя ўмовы, здымае значныя перашкоды, вызначае арыентыры наступных дзеянняў, у т. л. параметры і мажлівую структуру нацыянальнай эканомікі, – і толькі потым асобы ці суполкі ажыццяўляюць патрэбныя структурныя змены.

Варта зазначыць, што навуковая дыскусія ў дадзеным пытанні працягваецца паміж прыхільнікамі двух падыходаў (канцэпцыяў рэфармавання): «Вялікага прарыву (штуршку)», ці *радыкалізму* (пазначаецца ў заходніх навукоўцаў як The Big Bang approach), і паслядоўнага падыходу, ці *градуалізму* (адпаведна – gradualism).

Прыхільнікі першага (у т. л. Л. Бальцэровіч) выступаюць за хуткае і карэннае рэфармаванне ўсіх сфераў гаспадарчага развіцця грамадства. На іх думку, неабходна хуткая масавая прыватызацыя, паколькі першыя два этапы рэформаў пры захаванні дзяржаўнай уласнасці на сродкі вытворчасці не ствараюць неабходных стымулаў для развіцця прыватнай ініцыятывы і дасягнення неабходнай «крытычнай масы» прыватных суб'ектаў гаспадарання, пасля якіх і будзе закладзены падмурак паспяховага пераходу да рынку. Банкруты сыходзяць, дзяржава ім не дапамагае, а стварае і падтрымлівае роўныя ўмовы функцыянавання для ўсіх, а таксама не мае мажлівасцяў ажыццяўляць актыўнае ўмяшальніцтва ў дзейнасць прыватнікаў [4]. Такія навукоўцы надаюць перавагу на макраўзроўні (сукупнасці нацыянальных гаспадарчых адзінкаў) першапачатковай прыватызацыі дзяржаўных прадпрыемстваў і толькі потым іх рэструктурызацыі. Звязана гэта, пэўна, з маштабам самога працэсу маёмасных пераўтварэнняў у былых еўрапейскіх камуністычных краінах, што не меў аналагаў па памерах ахопу ў мінулым стагоддзі. Яшчэ адзін аргумент на карысць такога падыходу выказваюць амерыканскія эканамісты Дж. Сакс і Д. Ліптан, а таксама А. Бланшар (прыхільнікі «Вялікага прарыву»), што адбілася на першапачатковых спадзяваннях урадаў гэтых дзяржаваў і працаўнікоў (якія часткова спраўдзіліся) на тое, што новы ўласнік у асобе альбо замежнага інвестара (пажадана), альбо адміністрацыі, калектыву прадпрыемства ці сукупнасці акцыянераў здолее вырашыць тое, што не магла зрабіць дзяржава. Атрымоўваецца паслядоўная схема: масавая прыватызацыя–новы ўласнік–неабходныя пераўтварэнні ў структуры [4].

Другі шлях абгрунтоўваецца (у т. л. Г. Калодкам) неабходнасцю ажыццяўлення зменаў па раней вызначаным плане і кірунку, з мажлівасцю карэктавання (Г. Калодка даводзіць, што ў яго класіфікацыі *толькі першы этап* можа быць праведзены як радыкальным, так і памяркоўным шляхам, астатнія – толькі паслядоўна праз неабходнасць дзяржаўнага дагляду за працэсам зменаў і арыентацыі на ўласныя нацыянальныя інтарэсы) [2]. Масавая прыватызацыя (асабліва праз перадачу маёмасці насельніцтву краіны шляхам ваўчарызацыі ці продажу калектыву, адміністрацыі прадпрыемства) і ўтварэнне шматлікіх фірмаў пры слабасці і недастатковым развіцці фінансавага рынку не дазваляюць паспяхова ім павялічыць памеры ўласнага капіталу і, такім чынам, замацавацца на рынку, выйсці на траекторыю росту прадукцыйнасці працы і максімізацыі прыбытку. Недахоп сродкаў у паўсталых прыватнікаў змушае ўрад пераглядзець масавы і шпаркі характар прыватызацыі, адысці ад ранейшых планаў, а можа нават і ўскосна фінансаваць прыватнікаў, каб пазбегнуць абвальных банкруцтваў, якія могуць

выклікаць сумнеў грамадзянаў у самой неабходнасці рэформаў ці расчараванне іх вынікамі [4].

Іншы польскі эканаміст Б. Вінярскі прадстаўляе структурную палітыку (якая накіравана, згодна з яго думкай, на змену суадносінаў паміж сектарамі і сферамі нацыянальнай гаспадаркі, колькасцю і асартыментам прадукцыі, тэрытарыяльным, тэхналагічным і грамадскім уладкаваннем краіны) як адзін з галоўных абсягаў гаспадарчай палітыкі дзяржавы (урадавы ўплыў на дынаміку, структуру, функцыянаванне эканомікі) [5].

М. Кламут вылучае палітыку зменаў структуры ўласнасці (г. зн. накіраваную на прыватызацыю) як асобы кірунак структурнай палітыкі і адзначае паспяховую польскую маёмасную перабудову як галоўны чыннік поспеху такой структурнай трансфармацыі [5].

А. Налепка сцвярджае, што на пачатковым этапе польскай трансфармацыі галоўным напрамкам рэструктурызацыі суб'ектаў гаспадарання была іх прыватызацыя, пасля чаго адбылося іх (а таксама пазасталых дзяржаўных) арганізацыйнае ўладкаванне праз змяншэнне складовых адміністрацыйных адзінкаў і паўстанне на базе дзяржаўных суполкаў новых. Ён таксама залічвае прыватызацыю, г. зв. «маёмасную рэструктурызацыю» [3], да ліку аднаго з кірункаў (сфераў) структурнай перабудовы.

Падводзячы высновы, можна пакуль канстатаваць, што выкарыстаны ў большасці пераходных краінаў радыкальны падыход (хуткае, падтрыманае дзяржавай, стварэнне неабходнага рынкавага асяроддзя для прадпрыемстваў усіх формаў уласнасці) у першыя гады трансфармацыі прывёў да паспяховага разнявольвання эканомікі, большасць невялікіх і сярэдніх спрыватызаваных прадпрыемстваў (асабліва накіраваныя на г. зв. замежнага стратэгічнага інвестара) сама зладзіла наступную структурную перабудову, прадэманстраваўшы тое, што схема «наяўнасць эканамічнай свабоды – эканамічны рост» паказала сваю эфектыўнасць.

## ЛІТАРАТУРА

1. Бальцэровіч Л. Капіталізм. Сацыялізм. Трансфармацыя. – Мн.: Лекцыя, 2000. – 344 с.
2. Kołodko G.W. Od szoku do terapii. Ekonomia i polityka transformacji. – Warszawa: Poltext, 1999. – 396 s.
3. Nalepka A. Restrukturyzacja przedsiębiorstwa. Zarys problematyki. – Warszawa–Kraków: Wydawnictwo Naukowe PWN, 1999. – 252 s.
4. Roland G. On the speed and sequencing of privatisation and restructuring // The Economic Journal. – 1994. – № 104 (September). – P. 1158–1168.
5. Polityka gospodarcza. Red. Naukowa B.Winiarski. Wyd. drugie. – Warszawa: Wydawnictwo Naukowe PWN, 2001. – 696 s.

УДК 657.075 : 336.6

И.В. Макаренко, ст. преподаватель

# ЗАРУБЕЖНЫЕ МОДЕЛИ ДИАГНОСТИРОВАНИЯ РИСКА ВЕРОЯТНОСТИ БАНКРОТСТВА ПРЕДПРИЯТИЙ

This article is dedicated to analysis of foreign estimation methods of bankruptcy risk & to possibilities of using them on republican enterprises.